«За полчаса до весны» – такую рамантычную назву меў святочны канцэрт, прысвечаны Дню абаронцаў Айчыны і Міжнароднаму жаночаму дню. На пачатку мерапрыемства перад прысутнымі выступіў першы прарэктар універсітэта В.В. Маліноўскі. Васіль Васільевіч – матэматык па адукацыі, але лірык у душы: ён знайшоў цёплыя і пяшчотныя словы для віншавання, пачуўшы якія нельга было не ўсміхнуцца. Усмешкі на тварах прысутных былі і падчас выступу самадзейных артыстаў, якія падрыхтавалі яркія, запамінальныя нумары. Прыемным падарункам стаў танцавальны нумар выхаванцаў дзіцячага садка № 52. Канцэрт быў незвычайны і па-вясноваму цёплы. Завяршыў святочную праграму выпускнік нашага ўніверсітэта, спявак, кампазітар Андрэй Каралёў, які выканаў песню «За полчаса до весны».